УДК 531

В.В. Шахаб, старшы выкладчык

# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ І ШЛЯХІ ЯЕ ЎДАСКАНАЛЕННЯ

The lessons on Byelorussian in institutes and universities may be become the one of the most potent of the scientific knowledge.

Развіццё і адукацыя ніводнаму чалавеку не могуць быць дадзены ці паведамлены. Усякі, хто хоча да іх далучыцца, павінен дасягнуць гэтага праз уласную дзейнасць, уласныя сілы, уласнае напружанне… Таму самаўдасканаленне – сродак і адначасова вынік адукацыі.

А. Дыстэрвег

Ва ўмовах сучаснага дынамічнага адукацыйнага працэсу, які з'яўляецца адным з асноватворных кампанентаў развіцця дзяржавы, мэтанакіраваны характар набывае станаўленне асобы спецыяліста, здольнага, акрамя сваіх прафесійных абавязкаў, выпрацоўваць уласныя падыходы да навукі і культуры, сістэмы каштоўнасцяў і грамадскага жыцця. На сённяшні дзень у гэтым рэчышчы актуальным пытаннем бачыцца наладжванне менавіта такога вучэбнага працэсу, які зможа забяспечыць нараджэнне новых форм ведаў і прыёмаў іх выкарыстання як на практыцы, так і ў паўсядзённым жыцці. Немалаважным з'яўляецца і той аргумент, што найвялікшай каштоўнасцю дзяржавы з'яўляюцца высокаадукаваныя спецыялісты, таму асноўныя ўкладанні капіталу і інтэлектуальна-працоўных намаганняў павінны быць сканцэнтраваны ў накірунку назапашвання маладымі спецыялістамі прафесійнага майстэрства на працягу ўсяго перыяду жыцця. Прафесійная адукацыя ў сучасных умовах мусіць быць узнята на тую ступень падрыхтоўкі спецыялістаў, якая вызначаецца агульным узроўнем навукі і тэхнікі. Сам працэс працы пры гэтым варта ўсведамляць не як дакладна рэгламентаванае кола дзеянняў, а як непарыўны шлях самаўдасканалення асобы, звязаны з вырашэннем нестандартных задач, з прымяненнем новай інфармацыі, новых рэсурсаў. З гэтага пункту гледжання да навучання трэба падыходзіць як да бесперапыннага назапашвання ведаў і фундаментальных асноў чалавечай культуры; як да авалодання прыёмамі і спосабамі інавацыйнай дзейнасці па вырашэнні найскладанейшых тэхніка-тэхналагічных, экалагічных, арганізацыйна-эканамічных пытанняў, а таксама як да асэнсавання сутнасці сацыяльнай камунікацыі і ўмоў супрацоўніцтва з іншымі спецыялістамі.

Тып навучання, які існуе на сённяшні дзень, у асноўным зарыентаваны на адаптацыю чалавека да наяўных абставін вытворчасці і жыццядзейнасці. Тым самым асоба пазбаўляецца не толькі зацікаўленасці ў выніках сваёй працы, але і стымулу да жыцця. У сувязі з гэтым паўстае патрэба якаснага ўдасканалення навучальнага працэсу на аснове здабыткаў традыцыйнай педагогікі. Навукова-даследчая праца студэнтаў з'яўляецца, на наш погляд, менавіта той формай, якая здольная забяспечыць інтэнсіўны тып навучання пры захаванні асноўных педагагічных падыходаў і прынцыпаў. Галоўным накірункам навучання, такім чынам, стане асоба навучэнца, яе патрэбнасць у тых здольнасцях, якія неабходны, каб тварыць, трансцэндзіраваць, гэта значыць выходзіць за межы чалавечага пазнання.

Захаванне інтэлектуальнага патэнцыялу краіны і яго павышэнне непарыўна звязаны са станам навукова-даследчай работы студэнтаў. Выходзячы з аб'ектыўнага становішча навукі ў Рэспубліцы Беларусь можна зрабіць пэўныя высновы аб працэсе фільтрацыі навуковых кадраў. Так, з аднаго боку, гэта станоўчая з'ява, таму што займацца навукай павінны людзі, сапраўды адданыя ёй. Але дрэннае фінансаванне згаданай сферы абумоўлівае паступовае павышэнне узроставай планкі прафесарска-выкладчыцкага складу ВНУ, што з цягам часу непазбежна прывядзе да зніжэння колькасці навукоўцаў. Што датычыцца моладзі, то яе жаданне займацца навукай можа быць абумоўлена толькі адпаведнай матывацыяй. Рэаліі сённяшняга часу не могуць дазволіць матывацыю фінансавага характару, тым больш што прэстыжнасць навуковай працы падае. Таму адзіна магчымым спосабам уздзеяння на свядомасць студэнтаў бачыцца полівалентнасць адукацыйнага працэсу, арыентацыя на шырокае прафесійнае поле.

У такім кантэксце традыцыйную мадэль універсітэцкага навучання неабходна разглядаць праз прызму рэальнасці, у якой існуюць умовы для аб'ектывізацыі сур'ёзных навуковых ведаў. Варта спаслацца на вопыт развітых краін свету, у якіх дзяржстандарты універсітэцкай адукацыі прадугледжваюць значныя выдаткі часу на даследчую работу студэнтаў. У Рэспубліцы Беларусь таксама маюцца некаторыя напрацоўкі ў гэтай сферы. Так, Канцэпцыя рэалізацыі навучальна-даследчага падыходу ў сістэме шматузроўневай універсітэцкай адукацыі (аўтары – Лесніковіч А.І., Ціханаў Л.М. і інш. / БДПУ імя Максіма Танка) арыентуе на такі характар арганізацыі вучэбнага працэсу, пры якім студэнты авалодвалі б адпаведнымі ведамі, уменнямі і навыкамі праз непасрэдны ўдзел у навукова-даследчай дзейнасці. Такім чынам будуць створаны ўмовы для пераарыентацыі універсітэцкага навучання з нарошчвання пэўнага аб'ёму ведаў і іх засваення на развіццё творчай асобы, выхаванне культуры мыслення і разумовых здольнасцяў чалавека. Улік усіх элементаў навуковага пазнання, іх узаемасувязь і спалучэнне з заканамернасцямі вучэбнага працэсу можа забяспечыць актывізацыю пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, абумоўленай перш за ўсё неабходнасцю самарэалізацыі асобы ў грамадстве.

Універсітэцкае навучанне, бясспрэчна, мае справу з пэўнай колькасцю дакладных ведаў і дысцыплін, што вывучаюцца ў логіцы адных паняццяў. Актывізацыя навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў па такіх прадметах не ўяўляецца празмерна складанай, таму што вучэбнымі праграмамі і планамі прадугледжваецца напісанне курсавых і дыпломных работ, якія і з'яўляюцца адной з самых распаўсюджаных форм навукова-даследчай працы. Асобе выкладчыка належыць вядучая роля ў арганізацыі і заахвочванні студэнтаў, таму, усведамляючы гэта, многія спецыялісты вышэйшай школы перамяшчаюць цэнтр цяжару навучання з пасіўнага засваення навучэнцамі гатовых ведаў на актывізацыю разумовых і інтэлектуальных здольнасцяў моладзі (кружкі па спецыяльнасці, навукова-даследчыя лабараторыі, сумесныя навуковыя праекты і інш.).

На думку К. Ясперса, ісціна дасягаецца ў навуковым даследаванні, але яна ўяўляе штосьці большае, чым аб'ектывізаваныя навуковыя веды, таму што забяспечваецца дзейнасцю свядомасці, індывідуальным, асабістым выбарам даследчыцкай праблемы і спосабаў яе вырашэння. У сувязі з тым, што асобаснае вымярэнне аказваецца вызначальным фактарам для ўсёй навукова-даследчай дзейнасці, немалаважная роля ў актывізацыі навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў надаецца прадметам гуманітарнага цыкла, у прыватнасці курса роднай мовы. Беларуская мова як прадмет – не партыку-

лярная дысцыпліна. Яе трэба ўспрымаць як навуку, што арганізуе навучанне і моўныя зносіны на ўсіх этапах адукацыйнага працэсу.

Вядомы рускі вучоны С. І. Вавілаў адзначаў, што сучасны чалавек знаходзіцца перад бязмежнай колькасцю бібліятэк у становішчы золаташукальніка, якому неабходна адшукаць часцінкі золата ў пясчанай масе. Так і студэнт, які абцяжараны празмерна вялікім наплывам інфармацыі, павінен перш за ўсё сфарміраваць свой уласны стыль працы з ёй, свой падыход да назапашвання неабходных навуковых ведаў. І калі прыродазнаўчыя і тэхнічныя дысцыпліны разглядаюць толькі пэўныя грані існавання сусвету, то гуманітарныя звязаны з цэласным вывучэннем грамадства і прыроды чалавека. Зыходзячы з гэтага роля вывучэння ў ВНУ курса беларускай мовы ўсведамляецца дамінантнай з пункту гледжання стымулявання навукова-даследчай і пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Якія патэнцыяльныя магчымасці мае дадзены прадмет? Па-першае, гэта патэнцыяльныя магчымасці самой мовы – сродку забеспячэння камунікацыі і спосабу атрымання інфармацыі з навакольнага свету. Па-другое, гэта рэальнасць псіхалінгвістычнага ўздзеяння на свядомасць навучэнцаў з мэтай фарміравання ў іх асэнсаванай цікавасці да спосабаў пазнання навакольнай рэчаіснасці. Па-трэцяе, гэта наяўнасць метадычных здабыткаў, якія дазваляюць вучыць студэнтаў усвядомлена карыстацца мовай у міжасобасных стасунках, у прафесійнай дзейнасці, у навукова-даследчай дзейнасці. Такім чынам, абагульняючы вышэйсказанае, можна зазначыць наступнае: заняткі па беларускай мове ў ВНУ могуць стаць адным з самых моцных стымулаў навуковага пазнання.

На кафедры беларускай мовы БДТУ назапашаны пэўны вопыт у галіне актывізацыі навукова-даследчых пошукаў студэнтаў. Студэнцкая навуковая праца разглядаецца як абавязковы элемент навучання, як спецыфічны прыём развіцця здольнасцяў моладзі. Гэта і рэгулярны ўдзел студэнтаў у навукова-асветніцкіх канферэнцыях, якія праводзяцца два разы ў год, гэта і ўдзел у рэспубліканскіх конкурсах навуковых работ, у прэзідэнцкіх конкурсах. Так, у мінулым годзе трое аспірантаў па выніках конкурсу былі ўзнагароджаны дыпломамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і грашовымі прэміямі. Акрамя таго, выкладчыкамі кафедры рэгулярна праводзіцца са студэнтамі навучанне рэферыраванню навуковых тэкстаў, прыёмам іх апрацоўкі, правільнаму цытаванню аўтарскіх урыўкаў, анатаванню навуковых прац і г.д. Традыцыйна ў студэнтаў і аспірантаў выклікаюць вялікія цяжкасці правілы афармлення навуковых прац – курсавых і дыпломных работ, дысертацый, бібліяграфій да іх, аўтарэфератаў, рэзюмэ і інш. Кафедра беларускай мовы выпусціла дапаможнік «Навуковы стыль: водгук, анатацыя, рэцэнзія, дыпломная работа». Рыхтуецца да друку працяг аб афармленні аўтарэфератаў і дысертацый. З дапамогай выкладчыкаў, такім чынам, здымаецца наяўны комплекс студэнтаў і аспірантаў перад класічнымі канонамі напісання навуковай працы.

Вялікі філосаф І. Кант казаў: «Я адчуваю прагу ведаў, непакойнае імкненне штурхае мяне наперад і наперад, і кожны поспех на гэтай глебе дае мне радасць». Спадзяёмся, што намаганні прафесарска-выкладчыцкага калектыву БДТУ будуць выклікаць у студэнтаў як прагу да ведаў, так і імкненне самаўдасканальвацца.